УДК 821.161.3-1

Навуч. М.А. Хурсан
Навук. кір. выклад. Н.М. Мяркулава
(Філіял БДТУ БДЛК)

# «КАЛЯРОВАЯ ПАЛІТРА Ў ПАЭЗІІ ЯЎГЕНІІ ЯНІШЧЫЦ»

Праблема колерабачання мастацкага тэксту з’яўляецца адной з актуальных і прыярытэтных у сучаснай лінгвістычнай навуцы. Колеравая лексіка мае вялікае значэнне ў плане паказу моўнай карціны свету мастака і эстэтычнага дыялогу паміж пісьменнікам і чытачом.

Выкарыстанне пісьменнікам колеравай лексікі, яе творчае пераасэнсаванне з'яўляецца важным элементам дасягнення мастацкай вобразнасці і выразнасці.

Актуальнасць даследавання абумоўлена тым, што бачанне свету ў колеры - адно з найбольш моцных чалавечых пачуццяў. Трэба звярнуць увагу і на тое, што чалавек даволі лёгка запамінае фарбы, тым больш, што назваўшы адпаведнае слова, няцяжка выклікаць зрокавае ўяўленне колеру.

Выбар каларонімаў характарызуе час працы мастака, яго настрой, пачуцці. І светапогляд мастака выяўляецца ў мастацкім творы не толькі праз слова, але і яго творчую асобу. Таму цікава было прасачыць (і, адпаведна, акрэсліць як мэту працы), якія найменні колеру выбірае Яўгенія Янішчыц, а як вынік гэтага – якому колеру пісьменніца аддае перавагу на розных этапах жыццёвага і творчага перыяду.

Зыходзячы з названага, былі вызначаны наступныя задачы працы:

1 сабраць фактычны матэрыял са зборнікаў паэзіі Я.Янішчыц;

2 правесці тэкставы аналіз вершаў Яўгеніі Янішчыц;

3 класіфікаваць урыўкі з вершаў па выкарыстаных у іх колерах;

4 выявіць частотнасць ужывання прыметнікаў-каларонімаў у вершах Я.Янішчыц;

5 прасачыць дынаміку ужывання каларонімаў у творчасці паэткі.

Аб’ект даследавання: мова паэтычных твораў.

Прадмет даследавання: прыметнікі са значэннем колеру, выяўленыя ў вершах Я.Янішчыц.

У ходзе правядзення даследавання атрыманы наступныя практычныя вынікі:

1 частотнасць ужывання пэўных колеравых лексем дае падставы для характарыстыкі аўтарскіх асаблівасцей бачання свету ў фарбах, вызначэння колеравых густаў і эстэтычных поглядаў пісьменніцы;

2 выкарыстанне каларонімаў ілюструе спецыфіку яе творчай манеры і светаўспрымання ўвогуле.

На аснове праведзенага даследавання і атрыманых вынікаў можна зрабіць наступныя высновы:

1 колеравая сістэма вобразаў твораў Яўгеніі Янішчыц самая разнастайная: празрыстыя, светлыя, радасныя, таямнічыя, сумныя, фантастычныя, згушчаныя фарбы;

2 сімвалічная насычанасць, псіхалагічная абгрунтаванасць колеравай гамы твораў паэткі, іх унутраная глыбокая адпаведнасць зместу і характару рамантычна-рэалістычнага светабачання робяць творы Яўгеніі Янішчыц высокапаэтычнымі.

ЛИТЕРАТУРА

1. Бабіч, Ю.М. Колеравая і светлавая эстэтыка ў мове твораў Я. Коласа: Манаграфія / Віцебск, 2002. – 127 с.

2. Бахилина Н.Б. История цветового значения в русском языке. – Масква, – 1975. – 288 с.

3. Кожынава А.А. Ідэя святла ў вобразнай сістэме малітваў К. Тураўскага // Веснік БДУ, сер.4. Філалогія. – 1994, – №1, – с.21-24.

4. Ляшчынская В.А. Слова ў паэзіі Я. Купалы. – Мінск, 2004. – 272 с.

УДК 81′276.1-053.5

Учащ. В. Ю. Горбацевич
Науч. рук. преп. Е. Г. Колядина
(филиал БГТУ БГКПСМ)

## ИСПОЛЬЗОВАНИЕ АНГЛИЦИЗМОВ В РЕЧИ СОВРЕМЕННЫХ УЧАЩИХСЯ

Слова в нашей жизни играют огромную роль. С их помощью мы выражаем мысли и чувства, разговариваем. Изучение иностранного языка невозможно без изучения новых слов.